

АДДЗЕЛ БІБЛІЯТЭЧНАГА МАРКЕТЫНГУ
АСТРАВЕЦКАГА АДДЗЕЛА КУЛЬТУРЫ


**Аддзел бібліятэчнага маркетынгу**

**Астравецкай ЦБС**

**Складальнік:** А.Янкоўская

**Камп'ютэрнае афармленне:** Г.Францкевіч

**Рэдактар:** В.Пінчук


Мальская
сельская бібліятэка

Серыя "Яны прайшлі дарогамі вайны"

# Базюк Казімір Антонавіч

*ветэран Вялікай Айчыннай вайны*



2009



**1924**

Базюк Казімір Антонавіч нарадзіўся ў 1924 годзе ў весцы Новыя Якентаны. У час вайны ў яго весцы з'явіліся паліцыі і пачалі адбіраць маладых хлопцаў і дзяўчат на працу ў Германію. Павестку атрымаў і Казімір Антонавіч. Солтыс Герасім і падсолтыс Ягела пільна сачылі за выкананнем загадаў акупацыйнай арміі. Не з'явіцца па павестцы - значыць паставіць пад удар сваіх родных. У гэтым выпадку сям'я была б растраляна.

На досвітку, 4 кастрычніка 1943 года моладзь загрузіл,і як жывелу, у машыну і павезлі ў Вільню, а адтуль на цягніку у Кенігсберг на працу. Яго ўзяў да сябе Макс Троўс працаваць у агародзе. Так як ён быў палякам, што пацвярджаў нагрудны знак, ён не меў права пакідаць межы гаспадарк. Кармілі вельмі дрэнна і каб не пасылкі з дому можна было б і памерці з голаду. Спалі на хляве, праз дах якога ў час дажджу вада лілася на галаву. Працаваць даводзілася па 13-15 гадзін.

9 красавіка 1945 года ён быў вызвалены і пасля допытаў 5 мая 1945 года быў адпраўлены служыць у армію

АРХИВНАЯ СПРАВКА

В документах архивного фонда УКГБ РБ по Гродненской области значится Базюк Казимир Антонович, 1924 года рождения, уроженец д.Новые Якентаны Островецкого района Гродненской области, который проживая по месту рождения, 4 октября 1943 года был насильственно вывезен в Германию, где по 9 апреля 1945 года работал на сельском хозяйстве в районе г.Кенигсберга.

После освобождения и прохождения госпроверки 5 мая 1945 года выбыл в 202 запасной стрелковый полк.

Начальник подразделения
В.Н.Капитонов